# МУЗЫКА.

Жыў на сьвеци музыка. Многа хадзиў ён па зямли ды ўсё граў на скрыпцы. И плакала ў яго руках скрыпка, и такая была ў яго гранню нуда, што аж за сэрцэ хапала....

Плачэць скрыпка, льюць людзи сьлёзы, а музыка стаиць и выводзиць яшчэ жалосьней, яшчэ нудней. И балела сэрцэ, и падступали к вачам сьлёзы: так и ўдэрыўся бы грудзью аб зямлю, ды ўсё слухаў бы музыку, ўсё плакаўбы па сваей доли....

А бывала яшчэ й так, што музыка быццам вырастаў ў вачах людзей, и тады граў моцна, гучна: гудзяць струны, дзваниць рымка, бэс як гром гудзиць и грозна будзиць ад сна и завець ён народ. И людзи падымали апушчэные голавы, и гневам вяликим блишчали их вочы.

Тагды бледнели, и трасьлися, як ў лихоманцы, и хавалися ад страху, як тые гадзюки, ўсе крыўдзицели народу. Многа их хацела купиць у музыки скрыпку яго, але ён не прадаў яе никому. И хадзиў ён далей меж бедным людом и граннем сваим будзиў ад цяжкаго сна.

Але прыйшоў час, и музыки не стало: злые и сильные людзи кинули яго ў турму, и там скончылось жыцце яго.... И тые, што загубили музыку, ўзяли яго скрыпку и пачали самы грацъ на ёй народу.

Тольки ихняе гранне ничога людзём не сказала. — „Добра граеце“, — гаварыли им, — „дык ўсё ня тое!“ — И нихто ня мог растлумачыць, чаму ад грання музыки так моцна билося сэрцэ бедакоў. Нихто ня ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў ў игру. Душа яго знала ўсё тое горэ, што бачыў ён па людзёх; гэта горэ грало на скрыпцы, гэта яно вадзила смыкам па струнах; и ниводзин сыты ня мог так грацъ, як грало народнае горэ.

Прайшло шмат гадоў с таго часу. Скрыпка разбилась. Але памяць аб музыцэ ня згинула з им разам. И с-памеж таго народу, катораму ён кались граў, выйдуць дзесятки новых музыкоў и граннем сваим будуць будзиць людзей к сьвету, праўдзи, брацтву и свабодзи....

*Максим Б-вич.*